# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*2023 год*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**10 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.**

| **Часціны мовы, да якіх належаць амаформы** | **Словазлучэнні (сказы), якія ілюструюць лексічнае значэнне амаформаў (прыкладныя варыянты)** | **Падзел на марфемы** |
|---|---|---|
| *праліў* – назоўнік | *шырокі праліў* | *пра-лі-ў* (прыстаўка, корань, суфікс, нулявы суфікс, нулявы канчатак) |
| *праліў* – дзеяслоў | *праліў сваю кроў*; *праліў святло* | *пра-лі-ў* (прыстаўка, корань, суфікс, нулявы канчатак) |
| *тром* – лічэбнік (д. скл.) | *тром вучням* | *тр-ом* (корань, канчатак) |
| *тром* – дзеяслоў | *тром стол* | *тр-ом* (корань, канчатак) |
| *замок* – назоўнік | *адрамантаваць замок* | *за-мок* (прыстаўка, корань, нулявы канчатак) |
| *замок* – дзеяслоў (пр. ч.) | *замок пад дажджом* | *за-мок* (прыстаўка, корань, нулявы суфікс, нулявы канчатак) |
| *апёк* – назоўнік | *балючы апёк* | *а-пёк* (прыстаўка, корань, нулявы суфікс, нулявы канчатак) |
| *апёк* – дзеяслоў (пр. ч.) | *апёк руку* | *а-пёк* (прыстаўка, корань, нулявы суфікс, нулявы канчатак) |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 0,25 бала.*

***Заўвага! У адпаведнасці з прапанаванымі словамі могуць прыводзіцца іншыя прыклады амаформаў, напрыклад:*** *калі (дзеяслоў) – калі (прыслоўе), калі (дзеяслоў) – калі (злучнік)*. ***Галоўнае патрабаванне – наяўнасць амаформы (не лексічнага амоніма, не амографа, не амафона)!***

**Заданне 2.**

| Фразеалагізм | Значэнне | Кампанент | + |
|---|---|---|---|
| *танцаваць ад ...* | ‘пачынаць з самага прывычнага, паўтараючы ўсе дзеянні з самага пачатку’ | *парога* | |
| | | *дзвярэй* | |
| | | *акна* | |
| | | *печы* | + |
| | | *прыпечка* | |
| *... рубель* | ‘вялікі, але лёгкі заробак’ | *залаты* | |
| | | *доўгі* | + |
| | | *кароткі* | |
| | | *важкі* | |
| | | *лёгкі* | |
| *падвесці пад ...* | ‘хітрасцю, падманам ставіць каго-н. у цяжкае, непрыемнае становішча’ | *турму* | |
| | | *царкву* | |
| | | *манастыр* | + |
| | | *сцяну* | |
| | | *мур* | |
| *аж ... шуміць* | ‘лепей, мацней быць не можа’ | *пушча* | |
| | | *дуброва* | |
| | | *лес* | |
| | | *бор* | |
| | | *гай* | + |
| *стаяць на адной ...* | ‘займаць аднолькавае становішча, быць роўным у якіх-н. адносінах’ | *назе* | |
| | | *дошцы* | + |
| | | *прыступцы* | |
| | | *лесвіцы* | |
| | | *пасадзе* | |
| *... у (ў) галаве* | ‘хто-н. бесталковы, някемлівы’ | *мякіна* | + |
| | | *каша* | |
| | | *вецер* | |
| | | *пустата* | |
| | | *дурасць* | |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| Склон і лік | Словы | Граматычныя формы |
|---|---|---|
| Родны, множны | *з’ява* | – |
| Родны, множны | *далонь* | ***далоней / далоняў*** |
| Месны, адзіночны | *гай* | – |
| Творны | *грудзі* | ***грудзьмі / грудзямі*** |
| Родны, множны | *вясна* | ***вёсен / вёснаў*** |
| Месны, адзіночны | *бераг* | – |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| **Слова з тэксту** | **Лексіка-граматычная і граматычная характарыстыка** | **Выпраўленне памылкі (пры яе наяўнасці)** | **Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці)** |
|---|---|---|---|
| *некалькі*[1] | Прыслоўе: акалічнаснае меры і ступені | *Некалькі* – займеннік | Слова *некалькі* ў прыведзеным кантэксце з’яўляецца няпэўным (неазначальным) займеннікам, паколькі абазначае няпэўную колькасць |
| *першы*[2] | Прыметнік: якасны, поўны | *Першы* – лічэбнік | У прыведзеным кантэксце слова *першы* паказвае на парадак пры пералічэнні, а значыць, з’яўляецца лічэбнікам |
| *адзенне*[3] | Назоўнік: II скланення, у форме множнага ліку | У форме адзіночнага ліку | Назоўнік *адзенне* зборны, паказвае сукупнасць аднародных прадметаў як адзінае цэлае, па ліках не змяняецца |
| *калі*[4] | Прыслоўе: акалічнаснае часу, невытворнае | *Калі* – гэта злучнік | Слова *калі* ў значэнні ‘ў той час як’ з’яўляецца злучнікам |
| *менавіта*[5] | Часціца: сэнсавая, узмацняльная | Правільна | – |
| *памятайце*[6] | Дзеяслоў: пераходны, у форме будучага часу | Час не вызначаецца | Для дзеясловаў у форме загаднага ладу час не вызначаецца |

*За кожны правільны радок – 1 бал (0,5 бала за выпраўленне памылкі і 0,5 бала за яе тлумачэнне або 1 бал за сцвярджэнне правільнасці ў адпаведным прыкладзе).*

***Заўвага! Магчымыя іншыя правільныя тлумачэнні дапушчаных памылак.***

**Заданне 5.**

| **Слоўнікавы артыкул** | **З якога слоўніка ўзяты артыкул?** |
|---|---|
| АДЭКАЛОН. Спіртавы раствор розных пахучых рэчываў, які выкарыстоўваецца як парфумерны сродак. | тлумачальны / тэрміналагічны (хімія, касметалогія) |
| АДЭКАЛОН. Запаз. у XIX ст. з франц. м., дзе *eau de Cologne з'*яўляецца ўстойлівым словазлучэннем “вада з Кёльна”, “кёльнская вада”. | слоўнік запазычаных слоў / этымалагічны (слоўнік паходжання слоў) |
| АДЭКАЛОН. Слова ўтворана са складнікаў *eau* (вада), *de* (прыназоўнік роднага склону), *Cologne* (Кёльн); *невытв.*; адэкалончык, адэкалонны, адэкалоніць, адэкалоніцца, наадэкалоніцца. | словаўтваральны |
| АДЭКАЛО́Н *м. НВ* адэкало́н, *РД* адэкало́ну, адэкало́нам, адэкало́не; *мн. НВ* адэкало́ны, адэкало́наў, адэкало́нам, адэкало́намі, адэкало́нах. | граматычны / арфаграфічны / Слоўнік беларускай мовы |

**Агульная задача (варыянт адказу):** Прывядзенне цэлай сукупнасці звестак пра словы, што выклікаюць пэўныя цяжкасці ў напісанні, вырашае задачу забеспячэння гэтых слоў такім гісторыка-лінгвістычным каментарыем, які павышае правапісную кампетэнтнасць носьбітаў мовы, паколькі веданне паходжання і асаблівасцей адаптацыі таго ці іншага запазычанага слова да сістэмы беларускай мовы робяць празрыстай яго ўнутраную структуру, якая можа абумоўліваць пэўныя нюансы напісання адпаведнай лексічнай адзінкі.

*За кожнае правільнае вызначэнне слоўніка – 1 бал, за прынцыпова правільнае вызначэнне агульнай задачы – 1 бал.*

**Заданне 6.**

Формула правільная для сказаў **1**, **2**, **4**.

*За кожнае правільнае вызначэнне праўдзівасці / непраўдзівасці формулы – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Прыгодніцкі (экстрэмальны) турызм звязаны з вялікімі фізічнымі нагрузкамі і эмацыянальным напружаннем, з рызыкай і прыгодамі. Ён уяўляе сабой своеасаблівы спосаб адпачынку ў асабліва прывабных і не кранутых гаспадарчым засваеннем месцах з займаннем незвычайнымі і рызыкоўнымі відамі дзейнасці. Прыгодніцкія туры належаць *(адносяцца)* да разраду элітарнага адпачынку. Падобныя падарожжы патрабуюць значных затрат *(выдаткаў)*, тым не менш попыт на іх няўхільна расце.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,5 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| Тэрмін | Азначэнне тэрміна | Нумары прыкладаў |
|---|---|---|
| Амфібрахій | трохскладовая стапа з націскам на другім (сярэднім) складзе | 3, 5 |
| Актава | васьмірадковы верш, які часцей за ўсё пішацца пяцістопным або шасцістопным ямбам і рыфмуецца па схеме абабабвв | 2 |
| Рытарычнае пытанне | пытанне, якое не патрабуе адказу, заключае ў сабе сцвярджэнне | 6 |
| Анафара | паўтарэнне аднолькавых гукаў (слоў, выразаў) у пачатку вершаваных радкоў або суседніх строф | 1, 4 |

*За прынцыпова правільнае азначэнне кожнага тэрміна – 0,5 бала, за правільнае вызначэнне месца прыклада – 0,5 бала.*

**Заданне 9.**

| Сцверджанне | Праўдзівае/ непраўдзівае |
|---|---|
| “Песня пра зубра” Міколы Гусоўскага была напісана ў XVI ст. | + |
| Большасць даследчыкаў сёння прыпісвае аўтарства паэмы “Тарас на Парнасе” Канстанціну Вераніцыну | + |
| Пяру Яна Чачота належаць наступныя вершы “Покуль сонца ўзыдзе…”, “Мая дудка”, “Пад мачтай” | |
| Янка Купала быў рэдактарам газеты “Наша доля” | |
| Цётка – адна з пачынальніц жанру дарожнага эсэ ў беларускай літаратуры XX ст. | + |
| Помнік Янку Купалу пастаўлены ў Нью-Ёрку | + |
| Дзеянне паэмы “Бандароўна” Янкі Купалы адбываецца на тэрыторыі Расіі | |
| Якуб Колас вядомы як паэт і празаік | + |
| Максім Гарэцкі нарадзіўся на Міншчыне | |
| Большасць дзейных асоб апавядання “Роднае карэнне” Максіма Гарэцкага мелі рэальных прататыпаў | + |
| Галоўным героем апавядання “На пыльнай дарозе” Кузьмы Чорнага з’яўляецца дванаццацігадовы падлетак | + |
| У цэнтры ўвагі аповесці “Жураўліны крык” Васіля Быкава лёс шасці чалавек, якіх звязала вайна | + |
| Уладзімір Караткевіч ніколі не пісаў п’ес | |
| Яўгенія Янішчыц з’яўляецца аўтарам наступных радкоў: “…Любоў мая, ты песня, і маркота, // І спелы бор, і вольны гон ракі” | + |

*За кожнае правільнае вызначэнне праўдзівасці/непраўдзівасці сцверджання – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

Пісьменнік: Якуб Колас

*За правільна вызначанае імя – 0,5 бала, за кожнае правільна вызначанае месца – 0,5 бала, за беспамылковае вызначэнне аб'ектаў агляду кожнага месца – 1 бал, за часткова правільнае вызначэнне аб'ектаў агляду – 0,5 бала.*

*Рэклама ацэньваецца наступным чынам:*

| | |
|---|---|
| *1 бал* | *Тэкст мае адрасны характар (для вучняў старшых класаў), эфектыўны з пункту погляду мэты (пабуджае падарожнічаць па прапанаваным маршруце), вытрыманы стылёва.* |
| *0,5 бала* | *Тэкст або не мае адраснасці, або не з'яўляецца эфектыўным з пункту погляду мэты (не пабуджае падарожнічаць па прапанаваным маршруце), або стылёва не вытрыманы.* |
| *0 балаў* | *У тэксце адсутнічаюць або 2, або 3 з прапанаваных вышэй кампанентаў* |